Корень *-беред-* выделяется в слове *бередить*. Слово *бередить* возникло путем переразложения из **ob-verditi* (Фасмер I, 154), т.е. в результате упрощения группы согласных **-bv-* на стыке приставки и корня и исчезновения гласного в анлауте префикс вошел в состав корня.

Корень *-куропат-* вычленяется в слове *куропатка*. Он возник в результате сложения древнерусских *куръ* 'петух' и *пъта* 'птица' (Фасмер I, 371), т. е. современный связанный корень – результат опрощения более древней структуры слова.

## КРЫЛАТЫЯ СЛОВЫ З УЛАСНА БЕЛАРУСКІХ КРЫНІЦ

***М. А. Гаўрусева*** *(УА «МДУ імя А. А. Куляшова»)*
*Навук. кір.* ***Я. Я. Іваноў****,*
*канд. філал. навук, дацэнт*

Актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што крылатыя словы з уласна беларускіх крыніц мала даследаваныя ў беларускай фразеалогіі, у тым ліку паводле тэкставых крыніц свайго паходжання, і лексікаграфічна не апрацаваны ў поўным аб'ёме (часткова адлюстраваны толькі ў вядомым зборніку Ф. М. Янкоўскага [1] і лінгвакраіназнаўчым слоўніку Я. Я. Іванова і С. Ф. Івановай [2]). Мэта даследавання – акрэсліць колькасны склад і вызначыць тыпы тэкставых крыніц крылатых слоў уласна беларускага паходжання ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Фактычным матэрыялам даследавання паслужылі лексікаграфічныя крыніцы, мастацкія і публіцыстычныя тэксты, адкуль шляхам франтальнай выбаркі паводле этымалагічнага падыходу [3] было вылучана 96 крылатых слоў з уласна беларускіх крыніц. Метад даследавання – апісальны з элементамі этымалагічнага аналізу.

У выніку даследавання было высветлена наступнае. 1) колькасць крылатых слоў з уласна беларускіх крыніц складае каля 100 адзінак (каля 15 % ад агульнай колькасці крылатых слоў) у сучаснай беларускай літаратурнай мове; 2) тэкставыя крыніцы ўласна беларускіх крылатых слоў падзяляюцца на літаратурныя – мастацкія, публіцыстычныя і інш. (43 %) і фальклорныя – пераважна з ліку малых жанраў (57 %). Апошнія з'яўляюцца надзвычай прадуктыўнай крыніцай утварэння крылатых слоў у беларускай мове [4]. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры ўкладанні слоўніка крылатых слоў беларускай мовы, а таксама пры выкладанні фразеалогіі беларускай мовы ў ВНУ і школе.

**Літаратура**

1 Янкоўскі, Ф. Крылатыя словы і афарызмы (з беларускіх літаратурных крыніц) / Ф. Янкоўскі. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1960. – 135 с.

2 Іванова, С. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў: лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С. Іванова, Я. Іваноў. – Мінск : БФС, 1997. – 262 с.

3 Іванова, С. Ф. Крылатыя словы і праблема іх вывучэння ў беларускай мове / С. Ф. Іванова // Веснік БДУ. Серыя 4. – 2008. – № 2. – С. 18–21.

4 Іваноў, Я. Я. Крылатыя словы / Я. Я. Іваноў // Беларускі фальклор: энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 729–730.

## БЕЛАРУСКІЯ ПАРЭМІІ ПРА ПРАЦУ І НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

***Н. А. Дзікун*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***В. А. Ляшчынская****,*
*доктар філал. навук, прафесар*

Парэміі па праву называюць энцыклапедыяй народнага жыцця: у іх адлюстроўваюцца ўсе сферы дзейнасці чалавека, яго побыту, маралі, асвятляюцца

жыццёвыя праявы, праца як важнейшая справа жыцця чалавека, крытэрый яго маральнасці, даецца ім ацэнка: *Працу палюбіш – чалавекам будзеш; Хто з працай дружыць, той жыве і не тужыць* [1].

Вялікую групу складаюць парэміі пра поры года і працоўны народны каляндар. У кожнай пары года ўсебакова адлюстраваліся земляробчыя клопаты селяніна. На аснове багатага працоўнага вопыту селяніна ў парэміях сцвярджаецца неабходнасць своечасовага выканання пэўных сельскагаспадарчых работ, ад чаго залежыць ураджай: *Вясенні дзень год корміць; Сей у гразь – будзеш князь; Сей у пару – збярэш хлеба гару; Страчанага дня вясной не купіш; Увосень плача, хто на вясну скача.*

Апагеем сельскагаспадарчых клопатаў селяніна было лета, ад якога залежаў дастатак і ў зімовую пару: *Летам нагою коп – зімою губою хоп; Лета на зіму працуе; Летні дзень зіму корміць; Што ўлетку нагою, то ўзімку рукою; Хто ўлетку цяньку шукае, той узімку галадае; Хто ўлетку балюе, той узімку галадуе; Калі ўлетку на сонцы не папячэшся, то ўзімку з холаду натрасешся.*

У земляробчым народным календары розныя поры года ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя. Восень падводзіць мяжу рупнасці селяніна ў вясновую і летнюю працоўную часіну, яна з'яўляецца заключнай парой года ў земляробстве, самай жаданай для селяніна: *Увосень і верабей багаты.* Увосень каштоўнасць кожнай спрыяльнай часіны павялічваецца, бо павялічвалася колькасць работы: *Увосень работ восем.* Галоўнай адметнасцю восені з'яўляецца ўборка ўраджаю: *Закончыш жніво ўпору – будзе што вазіць у камору; Хто ў жніво халадку шукае, той галадае*, а таксама яго захаванне: *Не той хлеб, што на полі, а той, што ў гумне; Не хваліся нажаўшы, а хваліся намалаціўшы; Не лічы кветачкі ўвесну, а палічы ягадкі; Красна восень снапкамі, а зіма ўмалотам; Куранят увосень лічаць.*

Такім чынам, у беларускіх парэміях выразна раскрыты асаблівасці кожнай пары года з пункту гледжання адлюстравання іх работ у адпаведнасці з земляробчым календаром, а найбольшай увагай надзелена восень.

**Літаратура**

1 Лепешаў, І. Я. Слоўнік беларускіх прыказак : даведнік / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. – Мінск : БелЭН, 1996. – 352 с.

## ФЕЛЬЕТОН І ПАМФЛЕТ: СПРОБА ТЫПАЛАГІЧНАГА ПАРАЎНАННЯ ЖАНРАВЫХ ФОРМ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРЧАСЦІ К. ЧОРНАГА І К. КРАПІВЫ)

***К. В. Дзям'янава** (УА «МДУ імя А. А.Куляшова»)*
*Навук. кір. **А. В. Шарапава**,*
*ст. выкладчык*

У літаратуразнаўстве часам дапускаюць недакладнасць, называючы памфлет фельетонам і наадварот. Гэта блытаніна бярэ свой пачатак ад недакладнага ўяўлення пра прадмет, функцыі і задачы памфлета і фельетона, іх жанравых асаблівасцяў. Правесці выразную мяжу паміж памфлетам і фельетонам – задача даволі складаная, але вырашальная. Прадметам памфлета заўсёды з'яўляецца сацыяльна-камічнае: памфлетыст ніколі не зверне сваёй ўвагі на элементарна-камічнае. Прадметам жа фельетона ў асноўным з'яўляецца элементарна-камічнае і радзей – сацыяльна-камічнае. Адсюль і асноўная зброя фельетона – гумар, іронія. Фельетаніст смяецца з розных праяў элементарна-камічнага, паказвае яго немэтазгоднасць, непатрэбнасць з тым, каб вынішчыць данную з'яву, у той час, як ў памфлеце сарказм з'яўляецца асноўным сродкам выкрыцця адмоўных праяў у жыцці. Кропкі сутыкнення памфлета і фельетона дастаткова блізкія, але ж адрозненні ўсё ж такі існуюць. Яны, перш за ўсё, у самой сутнасці сарказма, які ў памфлеце заўсёды носіць палітычны